**АКАЛІЧНАСЦЬ** – даданы член сказа, які абазначае характар дзеяння, стану, прыметы, звязваецца з паяснёным словам прымыканнем або слабым кіраваннем.

Паводле сэнсавых адносін паміж акалічнасцю і паяснёным словам вылучаюць акалічнасці:

**месца –** маюць значэнне месца дзеяння, месца праяўлення стану і прыметы, напрамак руху; адказваюць на пытанні *дзе? куды? адкуль? дакуль?*; выражаюцца прыслоўямі, назоўнікамі ўскосных склонаў з прыназоўнікамі і без іх, спалучэннямі розных часцін мовы, устойлівымі зваротамі: *Васіль Аляксеевіч пастаяў, паглядзеў навокал…* (А. Жук); *Мы спыніліся сярод вёскі…* (В. Адамчык); *У бібліятэцы было халаднавата…* (А. Жук); *Алесь ішоў высокім берагам возера…* (П. Броўка); *Дзе-небудзь у зацішным кутку… мы абмяркоўвалі планы набегаў на дзедаву грушу* (А. Дзятлаў); *Высяцца гмахі завода цукровага тут жа, ля Слуцка, пад бокам* (Я. Непачаловіч);

**часу –** абазначаюць час дзеяння, час праяўлення стану і прыметы; адказваюць на пытанні *калі? колькі часу? з якога часу? да якога часу? як доўга?*; выражаюцца прыслоўямі, назоўнікамі ўскосных склонаў з прыназоўнікамі і без іх, колькасна-іменнымі спалучэннямі, устойлівымі зваротамі: *Штогод… восень упрыгожвае пушчу дыванамі верасоў* (Я. Пархута); *Шура спачатку ўзяўся ўставаць а палове восьмай…* (А. Жук); *Яшчэ да абеду ў пятніцу цярусілі снегам…* (А. Жук); *Маладым ранкам… туман зрушыць, скранецца пасля начной спячкі…* (Т. Хадкевіч); *За два дні жыццё Загацкага быццам увайшло ў каляіну* (А. Жук); *…Няма чаго ўставаць ні свет ні зара…* (І. Мележ);

**мэты –** маюць значэнне мэты дзеяння, адказваюць на пытанні *для чаго? з якой мэтай?*; выражаюцца прыслоўямі, прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў, інфінітывамі: *Знарок дзеля маскіроўкі баец трымаўся гумнаў і агародаў…* (В. Быкаў); *Жанчыны, што хадзілі ў лес па чарніцы, прынеслі ў фартухах сыраежкі і лісічкі* (М. Стральцоў); *Я сядзеў у вестыбюлі гасцініцы…, чакаў свайго калегу, каб ехаць з ім у горы – паглядзець славуты на ўвесь свет Рылскі манастыр* (Б. Сачанка); *Сама* [*маці*], *узяўшы капаніцу, пайшла на гарод акопваць бульбу* (Б. Сачанка);

**прычыны –** абазначаюць прычыну дзеяння, прычыну праяўлення стану, прыметы; адказваюць на пытанні *чаму? ад чаго? з-за чаго? па якой прычыне?*; выражаюцца прыслоўямі, прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў: *Загацкі згарача… пашыбаваў да лодкі* (А. Жук); *У роце было крыху горычна ад паху аеру…* (В. Казько); *На радасць і ўцеху чалавеку стварыла матухна-прырода лес на зямлі* (А. Савіцкі);

**спосабу дзеяння** маюць значэнне спосабу дзеяння, стану, якасці; адказваюць на пытанні *як? якім чынам? якім спосабам?*; выражаюцца прыслоўямі, дзеепрыслоўямі, дзеепрыслоўнымі зваротамі, устойлівымі зваротамі, беспрыназоўнікава- і прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў: *Мікітка таксама не рашыўсяісці напрасткі* (Б. Сачанка); *…З сосен цурком бегла вада…* (М. Стральцоў); *Камбайны, цяжка пакалыхваючыся, адзін за адным выходзілі з машыннага двара* (А. Жук); *Натужна дымяць “Ікарусы”, пастукваючы, снуюць трамваі* (Н. Маеўская); *Хлопец таксама засяпваў густым спакойным басам…* (А. Жук); *Яны* [*карэньчыкі*] *адышлі ў расе і рэзаліся без натугі…* (Я. Сіпакоў); *Сам Корзун не любіў дзейнічаць… з завязанымі вачамі…* (У. Шыцік);

**меры і ступені –** маюць значэнне меры, колькасці, ступені праяўлення дзеяння, стану, прыметы; адказваюць на пытанні *колькі? на колькі? як многа? у якой меры? у якой ступені?*; выражаюцца прыслоўямі, колькасна-іменнымі спалучэннямі, прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў, устойлівымі зваротамі: *…Усё*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*часцей* [*Стэфа*] *міжволі пазірала ў неба, на хмурынкі…* (Т. Бондар); *Праўда, майстар Мікіціч патрабуе, каб ён* [*Сева*] *прыходзіў раней, хвілін хаця б на пятнаццаць раней* (Н. Маеўская); *Мне чамусьці радасна да слёз…* (Я. Сіпакоў); …[*Мікалай*] *мокры да самага пояса* (Я. Сіпакоў); *…Салдат зноў адчуў подых дыму і на гэты раз затрывожыўся не на жарт* (В. Быкаў); *Да паўдня выпалала на жабін скок* (Ф. Янкоўскі);

**умовы –** маюць значэнне ўмовы, пры якой адбываецца, выконваецца дзеянне; адказваюць на пытанне *пры якой умове?*; выражаюцца дзеепрыслоўямі, дзеепрыслоўнымі зваротамі, прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў: *Не смуціся, страціўшы, не цешся, знайшоўшы* (Прык.); *Не ўзяўшы на душу, не хадзіць у кунтушу* (Прык.); *Не хвалі каня, запрагаючы, а дзеўку – выбіраючы* (Прык.); *Нельга не зачаравацца, гледзячы на гэты велічны помнік нашай прыроды* (Т. Хадкевіч); *Пры зручным выпадку я завітаю да вас*;

**уступкі --** маюць значэнне абставін, насуперак якім адбываецца, выконваецца дзеянне; адказваюць на пытанне *нягледзячы на што?*; выражаюцца прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў, дзеепрыслоўямі: *У горадзе, нягледзячы на вялікую радасць, панавала цішыня* (А. Савіцкі); *Наперакор стыхіі птушынае гняздо засталося цэлым; Нават хварэючы, Часця не пераставала займацца матэматыкай.*

Паводле структуры акалічнасці могуць быць:

а) **простымі** (калі выражаны адной словаформай): *Маці аж свеціцца ад шчасця* (С. Грахоўскі); *Раніцай ціхае надвор'е змяніў ветрык* (А. Пальчэўскі); *Паціхеньку адчыняюцца дзверы* (А. Пальчэўскі); *Збольшага тут быў напісаны і апошні раман "Людзі на балоце"* (І. Мележ);

б) **складанымі** (калі выражаны словазлучэннямі ці спалучэннямі слоў): *На трэці дзень на яго* [*Зыбіна*] *натрапіла дзяўчына* (І. Мележ); *Круглы год ішлі сюды людзі па кветкі* (В. Хомчанка); *Крыху больш за дзесяць год назад тут была дзяржаўная мяжа панскай Польшчы і Літвы…* (П. Броўка); *Гэта было гады за паўтара да пачатку вайны* (І. Мележ); *Загудуць, заціўкаюць паплавы на розныя галасы* (М. Ваданосаў); *Ад горада да горада, ад сяла да сяла ўюцца, бягуць дарогі* (Б. Сачанка).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ